

САМЫ МАЛАДЫ НАРОДНЫ ВЫБРАННІК



НАС ЧАКАЮЦЬ НОВЫЯ ПРЫШЧЭПКІ 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

24 КРАСАВІКА 2024 г.
СЕРАДА
№ 81 (30215)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Таццяна БРАНЦЭВІЧ, намеснік міністра эканомікі:**

*«Беларусы сталі жыць лепей. У параўнанні з 1995-м рэальныя грашовыя даходы насельніцтва выраслі больш як у 9 разоў, рэальная зарплата — у 12,4 раза, у тым ліку за тры гады бягучай пяцігодкі — на 14,6 %. У краіне забяспечаны стапрацэнтны доступ грамадзян да медыцынскіх паслуг. Па паказчыках у сферы адукацыі Беларусь уваходзіць у групу 30 найбольш развітых дзяржаў планеты. Па ўзроўні забяспечанасці насельніцтва жыллём наша краіна — адна з лідараў у СНД: па выніках 2022 года паказчык на аднаго чалавека склаў 29,4 кв. м, што ў 1,5 раза вышэй, чым 30 гадоў таму».*

# Вяршыня народаўладдзя




Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**Сёння распачынае сваю работу Усебеларускі народны сход. Гэта мерапрыемства ўжо сёмае па ліку ў сучаснай гісторыі нашай незалежнай краіны, але сёлета яно асабліва знакавае. Упершыню, згодна са змяненнямі і дапаўненнямі ў Канстытуцыю, прынятымі два гады назад на рэспубліканскім рэферэндуме, УНС набыў статус найвышэйшага прадстаўнічага органа дзяржаўнай улады. Амаль тысяча дзвесце чалавек, якія прадстаўляюць усе рэгіёны і сацыяльныя групы Беларусі, высокую ўладу і мясцовае самакіраванне, грамадзянскую супольнасць, збяруцца, каб вырашаць найважнейшыя пытанні развіцця краіны. Фактычна ў іх руках будучыня дзяржавы і народа, бо рашэнні, якія яны прымуць, не падлягаюць адмене або аспрэчванню нейкай іншай інстанцыяй.**

**На такое шырокае прадстаўніцтва, на наданне такіх паўнамоцтваў можа рашыцца толькі моцная дзяржава. Беларусь і сённяшнім днём у тым ліку даказвае ўсяму свету, што яна менавіта такая і ідзе па ўласным шляху развіцця і сапраўднага народаўладдзя.**

## КОРАТКА

- **Агароднінныя культуры ў Беларусі высаджаны на 26,6 працэнта запланаваных плошчаў.**
- Выручка арганізацый ДА «Белводгас» ад платнай рыбалкі за мінулы год наблізілася да Br1 млн.
- **Тэмп росту валавога рэгіянальнага прадукту Гомельскай вобласці ў студзені — сакавіку гэтага года склаў 101,6 працэнта да аналагічнага мінулагодняга перыяду.**
- Беларуская універсальная таварная біржа прыме ўдзел у стварэнні міжнароднай біржавой сістэмы індыкатараў таварных рынкаў.

Падзея

## Новыя сусветныя тэхналогіі і практыкаарыентаванасць

### Адкрыўся міжнародны форум «Ахова здароўя Беларусі»



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**У сталіцы адкрыўся XXIX Міжнародны медыцынскі форум «Ахова здароўя Беларусі — 2024», які ўключае спецыялізаваную выстаўку і шырокую дзелавую праграму. Сёлета ён прыўрочаны да 105-годдзя сістэмы аховы здароўя Беларусі. У рамках мерапрыемства адбудзецца каля 30 навукова-практычных канферэнцый і тэматычных семінараў з удзелам спецыялістаў вядучых РНПЦ краіны, у тым ліку пяць мерапрыемстваў па анкалагічнай тэматыцы. Сёлета ў выстаўцы бяруць удзел больш за 160 экспанентаў з васьмі краін. Сярод іх — вядучыя айчынныя і замежныя вытворцы медыцынскай тэхнікі, вырабаў медыцынскага прызначэння, расходных матэрыялаў, стаматалагічнага абсталявання і фармацэўтычнай прадукцыі.**

СТАР. 3

Дзяржаўны інтарэс

## ДЛЯ АГУЛЬНАЙ БУДУЧЫНІ

### Наколькі эфектыўна працуе сістэма інтэлектуальнай уласнасці?



**Штогод 26 красавіка ў свеце адзначаецца Міжнародны дзень інтэлектуальнай уласнасці. Яго тэма ў 2024 годзе — «Інавацыі і творчасць на карысць агульнай будучыні». Як працуе сістэма аховы інтэлектуальнай уласнасці ў нашай краіне? Беларусь — удзельнік 19 з 26 міжнародных пагадненняў у галіне абароны інтэлектуальнай уласнасці, якія працуюць пад эгідай Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці, расказаў першы намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь Дзяніс КАРЖЫЦКІ.**

— Ва ўсім свеце інтэлектуальная ўласнасць актыўна ўкараняецца ў эканамічны абарот, — падкрэсліў ён. — Адзін з моцных бакоў Беларусі — актыўнасць у галіне падачы заявак на вынаходніцтвы і карысныя мадэлі. Наша краіна з'яўляецца ўдзельнікам працэсаў патэнтавання ў рамках Еўразійскай эканамічнай супольнасці. Гэта дазваляе не адставаць ад сусветных працэсаў.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X